ЗАСЛУЖАНАЯ ЎЗНАГАРОДА

# Наш Пятровіч


ФОТА АЛЕГА БЕЛАВУСАВА

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, пісьменнік Міхась Даніленка **(на здымку)**, які працаваў у "Гомельскай праўдзе" з 1953 па 1982 год, аўтар каля двух дзясяткаў кніг , па хадайніцтву кіраўніцтва рэдакцыі днямі атрымаў ганаровае званне "Заслужаны журналіст Беларускага саюза журналістаў".

Шчыра павіншаваў з гэтай падзеяй 92-гадовага творцу калектыў "ГП". Пісьменніку ўручана грашовая прэмія.

Творчыя стасункі Міхася Пятровіча з роднай газетай працягваюцца і зараз. Даніленка дасылае свае апавяданні-абразкі, якія засяроджваюць чытачоў на роздуме: а ці так жывем, ці тое лічым каштоўным? Вось і зараз у рэдакцыйным багажы тры новыя допісы пісьменніка, адзін з іх прысвечаны 70-годдзю Вялікай Перамогі савецкага народа над фашызмам. Яе набліжаў і наш ветэран-калега. У 1941 годзе ён, выпускнік Рэчыцкага педвучылішча, быў мабілізаваны ў Чырвоную армію. Ваяваў на Паўднёва-Заходнім фронце. У маі 1942-га на Украіне быў кантужаны і трапіў у палон. У сакавіку 1944-га збег з лагера ваеннапалонных, і са жніўня 1945 года зноў у дзеючай арміі.

Ордэнам Айчыннай вайны другой ступені і шматлікімі медалямі адзначаны ваенныя заслугі пісьменніка. Да таго ж Міхась Даніленка з'яўляецца выдатнікам друку Беларусі, узнагароджаны дзвюма граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Так трымаць, Пятровіч!

**Ваша "Гомельская праўда"**